Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
“Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя І. П. Шамякіна”

**М. М. Шаўчэнка**

**В. П. Шаўчэнка**

# КУРСАВЫЯ ПРАЦЫ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб’яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура*

Мазыр
2013

МГПУ им. И.П.Шамякина

УДК 811.161.3(072)
ББК 075.8
Ш29

Аўтары: **М. М. Шаўчэнка**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА МДПУ імя І. П. Шамякіна;
**В. П. Шаўчэнка**, старшы выкладчык кафедры літаратуры УА МДПУ імя І. П. Шамякіна

**Шаўчэнка, М. М.**
Ш29 Курсавыя працы па методыцы выкладання беларускай мовы : дапаможнік / М. М. Шаўчэнка, В. П. Шаўчэнка. – Мазыр : УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2013. – 139 с.
ISBN 978-985-477-499-2.

У дапаможніку змяшчаюцца тэмы курсавых прац па методыцы выкладання беларускай мовы, да іх выпрацаваны рэкамендацыі і вызначаны пытанні, якія павінны кваліфікавана асвятляцца ў рабоце. Адабраны тэматычна-дыферэнцыраваны спіс літаратуры да кожнай тэмы.

Адрасуецца студэнтам філалагічных факультэтаў дзённай і завочнай формаў атрымання вышэйшай адукацыі.

**УДК 811.161.3(072)**
**ББК 075.8**

**ISBN 978-985-477-499-2**
© Шаўчэнка М. М., Шаўчэнка В. П., 2013
© УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2013

МГПУ им. И.П.Шамякина

Вучэбнае выданне

**Шаўчэнка** Міхаіл Мікалаевіч

**Шаўчэнка** Валянціна Паўлаўна

# КУРСАВЫЯ ПРАЦЫ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Дапаможнік

Адказны за выпуск А. В. Юніцкая
Карэктар Л. В. Жураўская
Арыгінал-макет Л. І. Федула

Падпісана ў друк 11.02.2013. Фармат 60х90 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman. Рызаграфія. Ум. друк. арк. 8,69.
Тыраж 100 экз. Заказ 4.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: установа адукацыі
«Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна».
ЛВ № 02330/0549479 ад 14 мая 2009 г.
Вул. Студэнцкая, 28, 247760, Мазыр, Гомельская вобл.
Тэл. (0236) 32-46-29

МГПУ им. И.П.Шамякина

# УВОДЗІНЫ

Курсавая праца па методыцы выкладання беларускай мовы – гэта адна з форм навучання, якая фарміруе і развівае навыкі самастойнай творчай даследчай працы студэнтаў, а таксама з’яўляецца формай кантролю ведаў, атрыманых у ходзе вывучэння прадмета. Яна павінна ўключаць самастойную распрацоўку тэмы з элементамі навуковага аналізу і ўменне рабіць грунтоўныя вывады. У ёй адлюстроўваюцца набытыя студэнтам тэарэтычныя веды і практычныя навыкі.

У дапаможніку прапануюцца тэмы курсавых прац, якія патрабуюць асвятлення найбольш важных праблем методыкі выкладання беларускай мовы. Гэтыя тэмы закранаюць наступныя пытанні методыкі: прадмет і задачы методыкі навучання роднай мове, родная мова як навучальны прадмет у сярэдняй агульнаадукацыйнай школе, шляхі рэалізацыі зместу праграмы, арганізацыйныя формы навучання роднай мове, методыка развіцця мовы і ўдасканалення вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў, методыка вывучэння раздзелаў навукі аб мове, паглыбленае вывучэнне беларускай мовы.

Курсавая праца выконваецца на аснове глыбокага самавывучэння метадычнай літаратуры, абагульнення вопыту работы настаўнікаў беларускай мовы, правядзення эксперыментаў у школе ў час педагагічнай практыкі.

У курсавой працы павінны выразна вылучацца: уводзіны, тэарэтычная, практычная часткі і заключэнне. Ва ўводзінах вызначаецца актуальнасць тэмы, фармулююцца мэта і задачы, даецца агляд літаратуры па тэме. У тэарэтычнай частцы ставіцца праблема, аналізуецца яе вырашальнасць у псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры, прыводзяцца яе асноўныя высновы. Практычная частка – гэта аналіз педагагічнага вопыту (уласнага ці іншых настаўнікаў), самастойнае апісанне педагагічнага эксперыменту, распрацоўкі планаў-канспектаў урокаў і сцэнарыяў выхаваўчых мерапрыемстваў па прадмеце. У заключэнні робяцца вывады і даюцца практычныя рэкамендацыі. Аб’ём заключэння не павінен перавышаць 1–2 старонак.

Па абранай тэме складаецца спіс выкарыстанай літаратуры, які падаецца ў алфавітным парадку. Неабходна прытрымлівацца ўзору афармлення бібліяграфічнага апісання крыніц, змешчанага ў дадатку А. Пры гэтым нельга абмяжоўвацца спісам рэкамендаванай літаратуры па тэме, а патрэбна абавязкова

МГПУ им. И.П. Шамякина

адбіраць літаратуру самастойна, вывучаючы каталогі і электронныя рэсурсы бібліятэк, бібліяграфічныя даведнікі, часопісы “Народная асвета”, “Беларуская мова і літаратура”, “Роднае слова”.

Кожны год у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь адбываюцца навукова-метадычныя канферэнцыі. Па іх выніках апублікаваны зборнікі навуковых артыкулаў, матэрыялы якіх могуць стаць надзейным сродкам у асвятленні выбранай студэнтам праблемы.

Вывучэнне літаратуры і школьнай дакументацыі, гутаркі з настаўнікамі і вучнямі, назіранні і эксперымент дадуць студэнту дастатковы матэрыял для выканання курсавой працы.

Тытульны ліст курсавой працы афармляецца належным чынам. (Узор афармлення глядзі ў дадатку Б). Аб’ём курсавой працы 25–30 старонак друкаванага тэксту, набранага ў тэкставым рэдактары Microsoft Word for Windows; шрыфт: памер – 14 пт.; тып – Times New Roman; міжрадковы інтэрвал – адзінарны; выраўноўванне – па шырыні старонкі; выстаўляюцца палі: злева, знізу і зверху па 25 мм, справа – 20 мм. Спасылкі на выкарыстаныя крыніцы падаюцца ў тэксце і абазначаюцца лічбамі ў квадратных дужках (напрыклад: [1, 26]).

Асноўныя матэрыялы працы павінны друкавацца выразна, чорным колерам сярэдняй тлустасці. Усе лініі, літары, лічбы і знакі павінны быць раўнамерна чорнымі па ўсім тэксце. Шчыльнасць тэксту павінна быць аднолькавай. Ілюстрацыйныя матэрыялы (прэзентацыі, схемы, табліцы, графікі, дыяграмы і інш.) могуць выдзяляцца каляровым чарнілам, тэкставае выдзяленне можа быць курсівам ці тлустым шрыфтам.

Загалоўкі раздзелаў неабходна выдзеліць тлустым шрыфтам і выраўняць па сярэдзіне старонкі. Усе главы і раздзелы патрэбна пачынаць з новай старонкі.

У канцы курсавой працы павінен размяшчацца спіс выкарыстаных крыніц і магчымыя дадаткі.

МГПУ им. И.П.Шамякина

# РАЗДЗЕЛ І. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## Тэма 1. Метадычная спадчына К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа)

У курсавой працы трэба прасачыць станаўленне К.М. Міцкевіча (Якуба Коласа) як вопытнага педагога, метадыста, дарадчыка настаўнікаў і моладзі. Асаблівую ўвагу неабходна скіраваць на аналіз яго кніг “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” і “Методыка роднае мовы”, на вызначэнне той ролі, якую яны адыгралі ў свой час. Неабходна паказаць актуальнасць названых унікальных крыніц пры распрацоўцы перспектыўных школьных тэхналогій моўнай адукацыі вучняў на сучасным этапе, важна ахарактарызаваць метады і прыёмы работы настаўніка, якія прапануе Якуб Колас для метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу роднай мове ў школе, пажадана даць кароткі гістарычны агляд метадаў навучання грамаце, раскрыць методыку чытання, пісьма (навучанне правапісу, правядзенне творчых пісьмовых работ, творчых дыктантаў).

Патрэбна паказаць сучасную трансфармацыю гэтых метадаў і прыёмаў працы настаўніка і вучняў у вучэбным працэсе па прадмеце ў самастойна распрацаваных планах-канспектах урокаў

### *Літаратура*

1. *Гаварушка, Я.* Колас і Замоцін / Я. Гаварушка // Маладосць. – 1982. – № 11. – С. 160–167.

2. Каласавіны: тэзісы дакл. і паведам. навук. канф., прысвеч. 109-й гадавіне з дня нараджэння і 85-годдзю пачатку літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа, Мінск, 1991 г. / Літаратурны музей Якуба Коласа; рэдкал.: В.П. Жураўлёў [і інш.]. – Мінск: Літаратурны музей Якуба Коласа, 1991. – 87 с.

3. *Колас, Я.* Методыка роднай мовы / Я. Колас // Збор твораў: у 14 т. – Мінск: Маст. літаратура, 1976. – Т. 12. – 528 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

4. *Логаш, А.Ф.* Народные основы педагогических взглядов Якуба Коласа / А.Ф. Логаш // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А.А. Куляшова. – 2004. – № 4. – С. 198–203.
5. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапаможнік для студэнтаў філалалагічных спецыяльнасцей установ, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.
6. *Піскун, У.Ц.* Коласаўская канцэпцыя моўнай адукацыі вучняў як дыдактычная аснова сучаснай лінгваметодыкі / У.Ц. Піскун // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў: матэрыялы II Міжнар. навук. канф., г. Мазыр, 22–23 крас. 2010 г. – Мазыр: УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, 2010. – С. 325–326.
7. *Піскун, Я.У.* Коласаўская канцэпцыя моўнай адукацыі вучняў пачатковых класаў / Я.У. Піскун // Каласавіны: матэрыялы навук. канф. – Мінск: Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, 1998. – С. 144–146.
8. *Родионов, В.Н.* Якуб Колас – педагог / В.Н. Родионов. – Минск: Изд-во БГУ, 1981. – 141 с.
9. *Яленскі, М.Г.* Методыка выкладання беларускай мовы: сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапаможнік / М.Г. Яленскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224 с.

## Тэма 2. Камунікатыўна-дзейнасны падыход пры навучанні беларускай мове

Пры аналізе дадзенай праблемы студэнту важна засяродзіць увагу на тым, што сучасны педагагічны працэс па беларускай мове скіраваны на фарміраванне і развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў.

Пры напісанні гэтай працы студэнту неабходна даць характарыстыку прынцыпаў, метадаў і прыёмаў, якія забяспечваюць камунікатыўна-дзейнасны падыход у навучанні беларускай мове. Важна сканцэнтраваць увагу на наступных пытаннях:

1. Асноўныя паняцці камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў навучанні беларускай мове.

МГПУ им. И.П. Шамякина

2. Неабходнасць развіцця камунікатыўных навыкаў асобы школьніка.

3. Камунікатыўна-дзейнасны падыход у навучанні беларускай мове.

4. Прынцыпы, метады і прыёмы фарміравання і развіцця камунікатыўных здольнасцей пры вывучэнні роднай мовы.

5. Сістэма працы, віды камунікатыўна-крэатыўных практыкаванняў і творчых прац, якія накіраваны на фарміраванне ў вучняў высокай маўленчай культуры і маюць камунікатыўную вартасць.

Асноўныя палажэнні курсавой работы павінны ілюстравацца прыкладамі, фрагментамі ўрокаў.

***Літаратура***

1. *Валочка, Г.М.* Як узнікаюць нашы выказванні? (Механізм стварэння тэксту як прадукту маўленчай дзейнасці) / Г.М. Валочка // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 11. – С. 41–45.

2. *Гамеза, Л.М.* Лінгваметадычныя асновы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы / Л.М. Гамеза // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2005. – № 1. – С. 108–112.

3. *Гамеза, Л.М.* Рэалізацыя камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў працэсе ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў / Л.М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 6. – С. 8–15.

4. *Даўгучыц, Т.Ф.* "Хлеб – усяму галава": урок развіцця маўлення: 8 кл. / Т.Ф. Даўгучыц // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 12. – С. 9–12.

5. *Доўгаль, Д.А.* Напісанне афіцыйных папер: урок развіцця маўлення: 6 кл. / Д.А. Доўгаль // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 11. – С. 3–7.

6. Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. ст. / Бел. гос. ун-т; в авт. ред. – Минск: РИВШ, 2009. – Вып. 9. – 102 с.

7. *Лаўрэль, Я.М.* Развіццё маўлення: праграма факультатыўных заняткаў для 5–6 кл. / Я.М. Лаўрэль // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 8. – С. 3–7.

МГПУ им. И.П. Шамякина

8. *Ляшчынская, В.А.* Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапаможнік / В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава. – Мінск: РІВШ, 2007. – 252 с.

9. *Макарэвіч, А.М.* Метадычныя рэкамендацыі па развіцці пісьмовай мовы вучняў і іх творчых здольнасцей (у кантэксце 10-бальнай сістэмы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў) / А.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 1. – С. 3–21.

10. *Манойла, В.Б.* Тэкстацэнтрычны падыход да навучання мове: з вопыту работы / В.Б. Манойла // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 10. – С. 3–8.

11. *Мароз, Д.В.* Урок развіцця мовы “Усё ў маім краі сэрцу міла”: 8 кл. / Д.В. Мароз // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 1. – С. 47–48.

12. *Мароз, С.* Нататка-разважанне ў газету пра ўдзел вучняў у азеляненні школьнай тэрыторыі, вуліцы, двара: урок развіцця маўлення / С. Мароз, М. Ржавуцкая // Роднае слова. – 2008. – № 4. – С. 62–64.

13. *Мартынкевіч, С.* Базавыя кампаненты методыкі развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы / С. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2009. – № 9. – С. 61–65.

14. *Мартынкевіч, С.* Тыпалогія практыкаванняў па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2011. – № 4. – С. 78–81.

15. *Мартынкевіч, С.В.* Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5–6 класы): вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С.В. Мартынкевіч. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010.

16. *Мартынкевіч, С.В.* Развіццё камунікатыўнай культуры школьнікаў на ўроках беларускай мовы / С.В. Мартынкевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 10. – С. 31–38.

17. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапаможнік для студэнтаў філалалагічных спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

18. *Мурына, Л.А.* Лінгвакультуралагічны падыход пры навучанні мовам у школе / Л.А. Мурына, Г.М. Валочка // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 11. – С. 34–37.

19. *Печенева, Т.А.* Реализация коммуникативного подхода при изучении морфологии в школе: именные части речи / Т.А. Печенева. – Минск: БГУ, 2001. – 124 с.

20. *Піскун, У.Ц.* Камунікатыўна-дзейнасны падыход да навучання роднай мове / У.Ц. Піскун, Л.А. Піскун // Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы: зборнік матэрыялаў рэсп. навук. метадыч. канф., Мазыр, 22–23 сак. 2001 г.; пад рэд. В.В. Валетава. – Мазыр: Мазырскі дзяржпедінстытут імя Н.К. Крупскай, 2001. – С. 219–221.

21. *Сянкевіч, В.І.* Камунікатыўнасць як уласцівасць мовы / В.І. Сянкевіч, С.Я. Кострыца // Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы: зборнік матэр. рэспубл. навук.-метад. канф., Мазыр, 22–23 сак. 2001 г.; пад рэд. В.В. Валетава. – Мазыр: Мазырскі дзяржпедінстытут імя Н.К. Крупскай, 2001. – С. 231–234.

22. *Таяноўская, І.У.* Навучанне кампазіцыйным і маўленчым прыёмам папулярызацыі вуснага выказвання: 10 кл. / І.У. Таяноўская, П.В. Грынчанка // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 6. – С. 19–23.

23. *Таяноўская, І.У.* Навучанне логіка-маўленчым прыёмам тлумачэння паняццяў: 10 кл. / І.У. Таяноўская, П.В. Грынчанка // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 3. – С. 35–37.

24. *Тушынскі, Д.М.* Развіццё моўнага мыслення вучня: вылучэнне асноўнай думкі тэксту / Д.М. Тушынскі // Роднае слова. – 2005. – № 9. – С. 54–56.

25. *Тушынскі, Д.М.* Развіццё навыку ўвагі да тэксту / Д.М. Тушынскі // Роднае слова. – 2007. – № 7. – С. 35–37.

26. *Тушынскі, Д.М.* Успрыняцце тэкстаў як разумовы навык і сродак развіцця пісьмовага маўлення / Д.М. Тушынскі // Псіхалогія. – 2007. – № 1. – С. 9–14.

МГПУ им. И.П. Шамякина

27. *Цыбульская, С.І.* Настольная кніга настаўніка беларускай мовы і літаратуры: метадычныя рэкамендацыі і нарматыўныя патрабаванні / аўт.-склад. С.І. Цыбульская. – Мінск: Сэр-Віт, 2007. – 173 с.

28. *Яленскі, М.Г* Методыка беларускай мовы: сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапаможнік / М.Г. Яленскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224 с.

## Тэма 3. Прынцыпы арганізацыі і методыка правядзення пазакласных мерапрыемстваў па беларускай мове

Пры вырашэнні дадзенай праблемы студэнту патрэбна акцэнтаваць увагу на тое, што важным сродкам фарміравання цікавасці і павагі да нацыянальнай мовы, яе невычэрпных скарбаў з'яўляецца пазакласная праца, якой у сучаснай агульнаадукацыйнай школе, на жаль, адводзіцца малая ўвага. Правядзенне пазакласных мерапрыемстваў па беларускай мове па-за раскладам асноўных заняткаў – з'ява не сістэматычная, рэдкая, перыядычная, а таму і малаэфектыўная. Ён можа падкрэсліць, што толькі планамерная, сістэматычная дзейнасць педагогаў па арганізацыі і правядзенні пазакласнай працы дасць станоўчыя вынікі: ажывіць цікавасць да роднага слова, вывучаемага прадмета, паглыбіць лінгвадыдактычныя веды вучняў, выхавае нацыянальна свядомага грамадзяніна, патрыёта сваёй роднай зямлі.

Для таго, каб напісаць курсавую працу па дадзенай праблеме, неабходна звярнуць увагу на наступныя пытанні: акрэсліць значэнне пазакласнай працы ў школе, вызначыць яе мэты і задачы; апісаць прынцыпы арганізацыі пазакласных мерапрыемстваў (прынцып добраахвотнасці, прынцып раўнапраўя на ўдзел у выхаваўчых мерапрыемствах, прынцып індывідуальнага падыходу да вучняў, прынцып выхаваўчага навучання, прынцып сістэматычнасці, прынцып узаемасувязі ўрокаў беларускай мовы і пазакласнай дзейнасці, прынцып развіцця актыўнасці і самастойнасці вучняў, прынцып займальнасці); паказаць міжпрадметныя і інтэгратыўныя



МГПУ им. И.П.Шамякина

сувязі ў пазакласнай працы; акрэсліць формы пазакласных мерапрыемстваў па роднай мове (масавыя, групавыя, індывідуальныя, пастаянныя, эпізадычныя); паказаць сістэмнасць у арганізацыі пазакласнай працы.

Аналізуючы гэтыя пытанні, студэнту неабходна звярнуць увагу на методыку арганізацыі і правядзення лінгвістычных канферэнцый, рукапісных лінгвістычных выданняў, моўных свят і гульняў.

У практычную частку курсавой працы патрэбна вынесці самастойна распрацаваныя сцэнарыі пазакласных мерапрыемстваў.

## *Літаратура*


1. *Бадзевіч, З.І.* Лінгвістычны конкурс: 9 кл. / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя // Роднае слова. – 1998. – № 2. – С. 126–136.
2. *Басава, Г.* Лінгвістычны конкурс: 10 кл. / Г. Басава // Роднае слова. – 1997. – № 12. – С. 105–114.
3. Внеклассная работа по русскому языку: учеб.-метод. пособие / сост.: Т.И. Татаринова, Н.Л. Соколова, Е.А. Татаринов. – Мозырь: УО МГПУ им. И.П. Шамякина, 2008. – С. 240.
4. *Даніловіч, М.* Збіранне тапаніміі ў пазакласнай працы па мове / М. Даніловіч // Роднае слова. – 2009. – № 2. – С. 94–97.
5. *Зубко, А.С.* Моўны турнір: 9–11 кл. / А.С. Зубко // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 4. – С. 57–59.
6. *Кандратовіч, А.П.* "Дзве мовы сталі блізкімі мне з малку…": вусны часопіс: 7 кл. / А.П. Кандратовіч // Роднае слова. – 2008. – № 8. – С. 76–79.
7. *Красней, В.* Лінгвістычны конкурс: 11 кл. / В. Красней // Роднае слова. – 1997. – № 11. – С. 75–84.
8. *Красоўская, А.П.* Падарожжа ў родную мову: сцэнар пазакласнага мерапрыемства для вучняў 8–9 кл. / А.П. Красоўская // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 6. – С. 59–63.
9. *Крупская, З.В.* Беларуская калыханка: сцэнар пазакласнага мерапрыемства для вучняў 5–7 кл. / З.В. Крупская, Н.І. Гардынец // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 5. – С. 59–64.


МГПУ им. И.П.Шамякина

10. *Куліковіч, У.* Лінгвістычны конкурс: 11 кл. / У. Куліковіч // Роднае слова. – 2006. – № 12. – С. 52–54.

11. *Лугоўскі, А.* Літаратурны дыктант: віктарына / А. Лугоўскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 10. – С. 35–39.

12. *Ляховіч, А.Ф.* Пакуль жыве мова, жыве народ: пазнавальнае мерапрыемства ў 4 кл. / А.Ф Ляховіч // Пачатковая школа. – 2009. – № 5. – С. 54–55.

13. *Ляшчынская, В.А.* Пазакласная работа па прадмету студэнта-філолага / В.А. Ляшчынская, В.І. Смыкоўская // Педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў. – Мінск: Выш. школа, 1983. – С. 105–110.

14. *Малажай, Г.М.* Алімпіяды па беларускай мове / Г.М. Малажай, В.П. Красней. – Мінск: ТДА Аверсэв, 2000. – 240 с.

15. *Малажай, Г.М.* Пазакласная праца па беларускай мове: вучэб. дапаможнік / Г.М. Малажай, С.Р. Рачэўскі. – Мінск: Выш. школа, 1990. – 254 с.

16. *Мянькоў, Ю.У.* Размаўляй са мной па-беларуску!: літаратурна-музычная імпрэза / Ю.У. Мянькоў // Роднае слова. – 2008. – № 8. – С. 80–82.

17. Пазакласная праца па беларускай мове і літаратуры: у 2 кн. – Мінск, 2007. – Кн. 1: Калі закончыўся ўрок / В.А. Мяжэвіч; Кн. 2: Ад свята да свята / В.А. Буланда.

18. *Руцкая, А.В.* Свята на вуліцы Слоўнікаў: уменне працаваць са слоўнікамі, даведнікамі / А.В. Руцкая // Беларуская мова і літаратура. – 1998. – № 4. – С. 97–105.

19. *Руцкая, А.В.* Тыдзень беларускай мовы і літаратуры ў школе / А.В. Руцкая. – Гродна. – 1999. – 107 с.

20. Слова, вылітае з бронзы: сцэнарый мерапрыемства, прысвечанага Дню беларускага пісьменства / Л. Букліс [і інш.] // Роднае слова. – 2009. – № 8. – С. 62 – 65.

21. *Солахаў, А.* Алфавіт. Літары Е, Ё, Ю, Я: Віктарына / А. Солахаў // Роднае слова. – 1999. – № 12. – С. 98–103.

22. *Трапашка, Л.С.* Турнір эрудытаў: гульня па тэме “Пераклад” для вучняў 6–7 кл. / Л.С. Трапашка // Роднае слова. – 2006. – № 5. – С. 71–73.

МГПУ им. И.П.Шамякина

23. *Цыбульская, С.І.* Тыдзень (дэкада) беларускай мовы і літаратуры ў школе: асаблівасці арганізацыі і правядзення / С.І. Цыбульская // Роднае слова. – 2009. – № 2. – С. 103–105.

24. *Юбко, В.А.* Арганізацыя і змест пазакласнай работы па мове / В.А. Юбко // Народная асвета. – 1985. – № 3. – С. 37–40; № 4. – С. 65–69.

## Тэма 4. Тэхналогія інтэграванага навучання на ўроках беларускай мовы

Пры напісанні работы студэнт павінен глыбей засвоіць, што інтэграванае навучанне ўяўляе сабою адну з ключавых педагагічных тэхналогій, якая садзейнічае выпрацоўцы спецыяльнай методыкі інтэграванага выкладання, звязвае ў адно цэлае як роднасныя, так і няроднасныя дысцыпліны і аказвае ўсебаковы ўплыў на іх глыбокае і свядомае асэнсаванне. Ён прыйдзе да высновы, што інтэграванае выкладанне прадмета ўздзейнічае на якасць засваення вучэбнага матэрыялу школьнікамі і з'яўляецца неад'емнай часткай адукацыйнага працэсу сучаснай школы.

Гэта праблема патрабуе грунтоўнага комплексна-метадычнага падыходу студэнта да вызначэння сутнасці тэхналогіі інтэграванага навучання беларускай мове і практычнага яго вырашэння з дапамогай распрацовак планаў-канспектаў урокаў.

Неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на распрацоўкі інтэграваных урокаў, якія былі апублікаваны ў розных метадычных і практыка-арыентаваных часопісах, пазнаёміцца з методыкай арганізацыі і правядзення такіх урокаў.

Студэнт павінен уважліва даследаваць тэхналогію інтэграванага навучання на аснове інтэграваных працэсаў паміж беларускай мовай і некаторымі іншымі дысцыплінамі.

У курсавой працы студэнт можа вырашаць наступныя пытанні:

1. Вызначыць змест тэхналогіі інтэграванага навучання на сучасным этапе.

МГПУ им. И.П. Шамякина

2. Раскрыць сутнасць інтэграванага навучання ў працэсе вывучэння беларускай мовы, беларускай літаратуры і мастацтва.

3. Паказаць сутнасць інтэграванага навучання ў працэсе вывучэння беларускай і рускай моў.

4. Выявіць змест інтэграванага навучання ў працэсе вывучэння беларускай мовы, гісторыі Беларусі і этнаграфіі.

5. Раскрыць сутнасць і магчымасці інтэгравання беларускай мовы і біялогіі і інш.

### *Літаратура*


1. Аб выніках эксперыменту па апрабацыі інтэграванага курса беларускай мовы і чытання / М.Г. Яленскі [і інш.] // Веснік адукацыі. – 2005. – № 8. – С. 16–23.

2. *Анисимов, В.И.* Интегративный подход приобщения школьников к художественной культуре: пособие для студентов-филологов / В.И. Анисимов. – Мозырь: РИФ “Белый ветер”, 1997. – 153 с.

3. *Анисимов, В.И.* Теория и технология интегративного образования / В.И. Анисимов, И.С. Жигарь, С.У. Филимонова. – Мозырь: МГПУ, 2003. – Вып. 1. – 236 с.

4. *Архипова, Т.* Межпредметные связи: в чём их актуальность / Т. Архипова // Учитель. – 2001. – № 4. – С. 34–36.

5. *Белов, В.* О некоторых вопросах интеграции в учебном процессе общеобразовательной школы / В. Белов // Учитель. – 2000. – № 6. – С. 46–53.

6. *Глазырына, Л.* Спосабы навучання беларускай мове на занятках па фізічнай культуры / Л. Глазырына // Пралеска. – 1993. – № 1. – С. 32.

7. *Данильцева, З.М.* Об интеграции уроков русского языка и литературы / З.М. Данильцева // Русская словесность. – 2001. – № 5. – С. 36–37.

8. *Захарэвіч, І.І.* Развіццё маўлення на карэкцыйна-адукацыйных занятках у класах інтэграванага навучання сярэдняй школы / І.І. Захарэвіч // Дэфекталогія. – 2004. – № 6. – С. 47–50.


МГПУ им. И.П.Шамякина

9. *Заяц, Л.І.* Інтэграваны абагульняльны ўрок па тэме “Назоўнік”: 5 кл. / Л.І. Заяц // Роднае слова. – 1997. – № 8. – С. 76–78.

10. *Лаўрыновіч, К.У.* Інтэграваны ўрок / К.У. Лаўрыновіч // Народная асвета. – 1992. – № 8. – С. 52–55.

11. *Левашова, Л.І.* Хто забыў сваю мову – усё губляе: інтэграваны ўрок беларускай мовы ў 6 класе / Л.І. Левашова // Народная асвета. – 2005. – № 4. – С. 61–63.

12. *Лепешаў, І.* Аналіз мовы на ўроках літаратуры / І. Лепешаў // Роднае слова. – 2000. – № 7. – С. 57–60.

13. *Лявоненка, С.* Інтэграваныя ўрокі-абагульненні ў 8 класе: беларуская мова, літаратура, гісторыя, геаграфія, біялогія, музыка, сусветная айчынная культура / С. Лявоненка // Роднае слова. – 2005. – № 1. – С. 52–55.

14. *Лядоўскі, У.А.* Каб была карысць / У.А. Лядоўскі // Народная асвета. – 1983. – № 2. – С. 47–50.

15. *Ляшук, В.Я.* Міжпрадметныя сувязі ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры / В.Я. Ляшук, Г.М. Малажай. – Мінск: Нар. асвета, 1992. – 126 с.

16. *Малажай, Г.М.* Выкарыстанне літаратурных твораў пры вывучэнні сінтаксісу і пунктуацыі / Г.М. Малажай // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 8. – С. 62–66.

17. *Малажай, Г.М.* Міжпрадметныя сувязі з літаратурай пры вывучэнні сінтаксісу і пунктуацыі / Г.М. Малажай // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1989. – № 12. – С. 25–28.

18. *Сілівон, В.* Вучыць мове малюнак: фарміраванне навыкаў творчага расказвання праз малюнак / В. Сілівон // Пралеска. – 1997. – № 4. – С. 9–14.

19. *Шаўчэнка, М.М.* Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове: 8 кл. / М.М. Шаўчэнка, М.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 7. – С. 55–58.

МГПУ им. И.П. Шамякина

## Тэма 5. Выкарыстанне асобасна арыентаваных тэхналогій у працэсе навучання роднай мове

Студэнт павінен адзначыць, што ў сучаснай сярэдняй агульнаадукацыйнай школе прыярытэтамі адукацыі і выхавання дзяцей усё больш і больш становяцца гуманістычныя спосабы

навучання, якія патрабуюць змен у арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Таму ўзнікла неабходнасць комплекснага вырашэння цэлага шэрагу пытанняў па развіцці і ўдасканаленні навучання.

У час працы над тэмай студэнт павінен дакладна ўсвядоміць, што сярод гэтых пытанняў важным з’яўляецца асобасна арыентаваная пабудова педагагічнага працэсу. Гэта патрабуе ад настаўніка выкарыстання інавацыйных тэхналогій навучання, якія дадуць магчымасць не толькі эфектыўна засвойваць вучэбны матэрыял, набываць практычныя навыкі і ўменні па прадмеце, але і зробяць інтэрактыўным навучанне, у ходзе якога выявіцца вучэбна-пазнавальная дзейнасць кожнага вучня.

У курсавой працы патрэбна даць тэарэтыка-метадалагічнае апісанне тэхналогій асобасна арыентаванага педагагічнага працэсу, апрабіраваныя самастойныя распрацоўкі ўрокаў. Варта засяродзіць увагу на тое, што кожная тэхналогія навучання мае мэтавую накіраванасць, сістэмныя навуковыя і адукацыйныя падыходы, сістэму мэтанакіраванай сумеснай дзейнасці настаўніка і вучня, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці школьнікаў, агульныя вынікі і абмежаванне ў выкарыстанні.

Студэнт можа разгледзець наступныя пытанні:

1. Сутнасць педагагічных тэхналогій навучання.

2. Прыкметы тэхналогій асобасна арыентаванага навучання.

3. Выкарыстанне асобасна арыентаваных тэхналогій навучання на ўроках беларускай мовы:

3.1. Тэхналогія інтэрактыўнай гульні.

3.2. Тэхналогія рознаўзроўневага навучання.

3.3. Тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання.

3.4. Тэхналогія модульнага навучання.

3.5. Дэльтан-тэхналогія.

3.6. Мультымедыйныя прэзентацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы.

МГПУ им. И.П.Шамякина

## *Літаратура*


1. *Бурнель, А.Ю.* Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з выкарыстаннем тэкстаў пра хлеб) / А.Ю. Бурнель // Роднае слова. – 2007. – № 5. – С. 36–39.

2. *Буцэнка, А.Л.* Функцыянальная стылістыка: блочная тэхналогія навучання: 11 кл. / А.Л. Буцэнка // Роднае слова. – 2003. – № 3. – С. 70–73.

3. *Бухавец, В.*У. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В.У. Бухавец; пад рэд. С.І. Цыбульскай. – Мінск: СэрВіт, 2006. – 208 с.

4. *Віктаровіч, Т.А.* Адаптыўная сістэма навучання. Неабходнасць пераходу да новых тэхналогій / Т.А. Віктаровіч // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 1. – С. 10–13.

5. *Грыневіч, С.У.* Каардынуем, кансультуем, кантралюем: модульная тэхналогія пры вывучэнні тэмы "Адасобленыя члены сказа" ў 8 класе / С.У. Грыневіч // Народная асвета. – 2005. – № 8. – С. 41–43.

6. *Душэўская, В.Л.* Выкарыстанне камп'ютарных тэхналогій пры вывучэнні моўнай экспрэсіі / В.Л. Душэўская, Г.М. Канцавая, М.П. Канцавы // Информатизация образования. – 1999. – № 3. – С. 86–92.

7. *Жуковіч, М.В.* Тэхналогія дзелавой і займальнай гульні / М.В. Жуковіч // Роднае слова. – 2004. – № 4. – С. 58–61.

8. *Жуковіч, М.В.* Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / М.В. Жуковіч. – Мінск: Аверсэв, 2007. – 157 с.

9. *Запрудскі, М.І.* Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі / М.І. Запрудскі. – Мінск: Сэр-Віт, 2004. – 288 с.

10. *Кажура, В.В.* Урок у 6 класе па тэме "Роля прыметнікаў у мастацкіх і навуковых апісаннях": французская педмайстэрня / В.В. Кажура // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 4. – С. 15–16.


МГПУ им. И.П.Шамякина

11. *Кашлев, С.С.* Современные технологии педагогического процесса: пособ. для педагогов / С.С. Кашлев. – Минск: Университетское, 2000. – 95 с.

12. *Кендыш, Н.А.* У краіне кветак: урок развіцця мовы па тэхналогіі “французскія педагагічныя майстэрні”: 5 кл. / Н.А. Кендыш // Роднае слова. – 2004. – № 5. – С. 29–32.

13. *Кендыш, Н.А.* Ужыванне часоў дзеяслова: урок па модульнай тэхналогіі: 6 кл. / Н.А. Кендыш // Беларуская мова і літаратура, 2009. – № 4. – С. 28–31.

14. *Кныш, М.* Класіфікацыя адукацыйных тэхналогій навучання / М. Кныш // Роднае слова. – 2005. – № 2. – С. 58; № 3. – С. 65–66.

15. *Ксензова, Г.Ю.* Перспективные школьные технологии: учеб.-метод. пособие / Г.Ю. Ксензова. – М.: Педагогическое общество России, 2000. – 224 с.

16. *Кулікоўская, Т.І.* Выкарыстанне тэхналогіі калектыўных спосабаў навучання / Т.І. Кулікоўская // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 12. – С. 38–45.

17. Матывацыйная дзейнасць настаўнікаў на ўроках беларускай мовы / А.С.Вахільчук [і інш.]; пад агульнай рэд. А.С. Вахільчук. – Мазыр: ТАА ВД Белы вецер, 2009. – 146 с.

18. *Мацвеева, Я.В.* Развітанне з марфалогіяй: урок-залік па тэхналогіі адаптыўнай школы: 7 кл. / Я.В. Мацвеева // Роднае слова. – 2003. – № 3. – С. 73–76.

19. *Мачэль, А.* Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у выкладанні мовы і літаратуры / А. Мачэль // Роднае слова. – 2007. – № 2. – С. 61–62.

20. *Навумчык, М.І.* Прымяненне тэхналогіі канцэнтраванага навучання пры засваенні тэмы “Віды аднасастаўных сказаў з галоўным членам выказнікам”: 8 кл. / М.І. Навумчык // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 1. – С. 44–50.

21. *Плешак, А.Л.* Мастер-класс: интерактивные методы в практике работы учителя / А.Л. Плешак, М.Ф. Путря // Народная асвета. – 2009. – № 1. – С. 30–34.

22. *Поведайко, С.Л.* Технология разноуровневого обучения / С.Л. Поведайко // Народная асвета. – 2003. – № 8. – С. 41–43.

МГПУ им. И.П. Шамякина

23. *Пышко, Л.Л.* Пытальныя і адносныя займеннікі: модульны ўрок: 6 кл. / Л.Л. Пышко // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 3. – С. 13–14.

24. *Рымша, Т.М.* Маці: урок беларускай мовы па тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрняў: 6 кл. / Т.М. Рымша // Роднае слова. – 2005. – № 6. – С. 58–59.

25. Урок-презентация / авт.-сост. В.Н. Пинчук, Е.П. Семёнова, Н.Н. Пинчук. – Минск: Красико-Принт, 2009.

26. *Шимутина, Е.* Кейс-технологии в учебном процессе / Е. Шимутина // Школьные технологии. – 2009. – № 5.

27. *Шкарадзёнак, Т.П.* Правапіс суфіксаў дзеепрыслоўяў: тэхналогія праблемнага навучання: 7 кл. / Т.П. Шкарадзёнак // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 10. – С. 52–54.

28. *Яленскі, М.Г.* Асобава арыентаванае навучанне беларускай мове / М.Г. Яленскі // Беларуская мова і літаратура. – 2000. – № 3. – С. 82–99.

29. *Яленскі, М.Г.* Асобасна арыентаваная тэхналогія навучання мове / М.Г. Яленскі // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 12. – С. 8–10.

## Тэма 6. Займальны матэрыял на ўроках беларускай мовы

Пры напісанні курсавой працы студэнту неабходна падкрэсліць, што сучасны ўрок беларускай мовы павінен адпавядаць аптымальнаму рэжыму і іншым абавязковым патрабаванням, якія вызначае сучасная дыдактыка. Сярод такіх патрабаванняў з’яўляецца актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку, якая ў працэсе навучання адпавядае цэласнай сістэме працы настаўніка.

Студэнт павінен адзначыць, што ў гэтай сістэме важнае месца адводзіцца зацікаўленасці школьнікаў прадметам, якая дасягаецца пасродкам займальнага дыдактычнага матэрыялу – спецыяльна распрацаваных да вывучаемых тэм адпаведных творчых заданняў, дэфармаваных практыкаванняў, цікавых моўных гульняў, рэбусаў, красвордаў, чайнвордаў, крыптаграм і г. д., якія лаканічна характарызуюць пэўныя моўныя з’явы, што былі вядомы школьнікам з папярэдніх заняткаў ці засвоены на этапе вывучэння новага матэрыялу, і таму дапамагаюць свядомаму засваенню сутнасці гэтых з’яў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У курсавой працы студэнт павінен паказаць, што ён умее правільна выкарыстоўваць займальны матэрыял на ўроках беларускай мовы.

Студэнту важна паказаць, што ўжыванне цікавага займальнага матэрыялу на розных этапах урока абвастрае зрокавую памяць вучня, актывізуе яго думку, абуджае да творчасці, раскрывае і развівае патэнцыяльныя задаткі і здольнасці, павышае эфектыўнасць успрыняцця лігвістычнага матэрыялу, уплывае на адносіны вучняў да вучобы, выклікае цікавасць у вучняў да ведаў, павышае ўзровень моўнай культуры. Займальна-гульнёвыя моманты ўрока даюць магчымасць вырашыць кагнітыўна-камунікатыўныя задачы ў навучанні беларускай мове.

Пры выкананні дадзенай курсавой працы студэнту неабходна апісаць розныя віды займальнага матэрыялу, вызначыць карысць яго пры вывучэнні пэўных раздзелаў і тэм, выпрацаваць метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні займальнага матэрыялу на пэўных уроках, самастойна падрыхтаваць такі матэрыял і ўключыць яго ў распрацоўкі ўрокаў.

### ***Літаратура***

1. *Агеева, И.Д.* Занимательная лексика. Многозначные слова и омонимы: стихотворный материал для 6–7 классов / И.Д. Агеева // Педагогическое творчество. – 2005. – № 1. – С. 10–12.

2. *Акінчыц, А.А.* Два караблі: гульня-спаборніцтва па беларускай мове для вучняў 6 класа / А.А. Акінчыц, Г.К. Конаўна // Роднае слова. – 1999. – № 7. – С. 134–138.

3. *Бобайцева, В.В.* Филологические кроссворды / В.В. Бобайцева // Русская словесность. – 1997. – № 2. – С. 95 – 97; № 4. – С. 96–97.

4. *Верціхоўская, М.* Лексіка: займальны матэрыял / М. Верціхоўская // Роднае слова. – 2000. – № 11. – С. 71.

5. *Іўліева, Л.* Скарагаворкі: займальны матэрыял / Л. Іўліева // Роднае слова. – 2009. – № 6. – С. 85.

МГПУ им. И.П.Шамякина

6. *Кісялевіч, І.І.* Востраў памылак: займальная гульня для 5 класа / І.І. Кісялевіч // Роднае слова. – 2006. – № 5. – С. 70–71.

7. *Косолапкова, А.А.* Дидактические игры при изучении темы “Лексика” / А.А. Косолапкова // Русский язык в школе. – 1990. – № 6. – С. 35–37.

8. *Мяжэвіч, В.* Чацвёрты лішні: займальны матэрыял / В.Мяжэвіч // Роднае слова. – 2001. – № 4. – С. 70.

9. *Панов, М.В.* Занимательная орфография: кн. для внеклассного чтения учащихся 7–8 кл. / М.В. Панов. – М., 1984. – 159 с.

10.*Паўлоўская, В.І.* Мова: цікава і займальна / В.І. Паўлоўская. – Мінск: Нар. асвета, 1989. – 221 с.

11. *Подгаецкая, И.М.* О составлении лингвистических задач / И.М. Подгаецкая // Русский язык в школе. – 1980. – № 6. – С. 53–58.

12. *Рагаўцоў, В.* Вершы: займальны матэрыял / В. Рагаўцоў // Роднае слова. – 2005. – № 4. – С. 70–71.

13. *Саўко, У.* Дзелавая гульня: развіццё мовы і прафесійная арыентацыя вучняў / У. Саўко, І. Саўко // Роднае слова. – 1992. – № 11. – С. 28–30.

14. *Снапкова, Т.В.* Мы запрашаем вас на баль: ролевая гульня па беларускай мове для вучняў 5 класаў / Т.В. Снапкова // Роднае слова. – 2002. – № 5. – С. 63–64.

15. *Солахаў, А.В.* Займальна ад А да Я / А.В. Солахаў. – Мінск: Лексіс, 2004. – 260 с.

16. *Солахаў, А.В.* Займальны матэрыял да тэмы “Лексіка” ў 5 класе / А.В. Солахаў // Роднае слова. – 1997. – № 5. – С. 88–90; № 6. – С. 100–104.

17. *Солахаў, А.В.* Займальны матэрыял па беларускай мове / А.В. Солахаў. – Мінск: Лексіс, 2004. – 173 с.

18. *Солахаў, А.В.* Займальны матэрыял: адназначныя і мнагазначныя словы / А.В. Солахаў // Роднае слова. – 1997. – № 7. – С. 92–102.

19. *Солахаў, А.В.* Словаўтварэнне і арфаграфія. Значымыя часткі слова: займальны матэрыял / А.В. Солахаў // Роднае слова. – 1998. – № 2. – С. 137–143.

МГПУ им. И.П.Шамякина

20. *Солахаў, А.В.* Словаўтварэнне і арфаграфія. Корань. Суфікс. Прыстаўка: займальны матэрыял / А.В. Солахаў // Роднае слова. – 1998. – № 5. – С. 114–121.

21. *Солахаў, А.В*. Словаўтварэнне і арфаграфія. Чаргаванне гукаў: займальны матэрыял / А.В. Солахаў // Роднае слова. – 1998. – № 7. – С. 113–119.

22. *Солахаў, А.В.* Устарэлыя словы і неалагізмы. Спрадвечнабеларускія і запазычаныя словы. Фразеалагізмы: займальны матэрыял / А.В. Солахаў // Роднае слова. – 1997. – № 10. – С. 113–120.

23. *Солахаў, А.* Лік назоўнікаў: займальны матэрыял / А. Солахаў // Роднае слова. – 2009. – № 11. – С. 66–68.

24. *Старычонак, В.Д.* Займальная філалогія / В.Д. Старычонак. – Мінск: Выш. школа, 1998. – 254 с.

25. *Хроленко, А.Т.* Деловые игры по русскому языку как приём активизации учебного процесса / А.Т. Хроленко // Русский язык в школе. – 1985. – № 6. – С. 37–39.

26. *Цыганкин, Д.В*. Занимательная грамматика: пособ. для учителя / Д.В. Цыганкин, Н.К. Приставкин. – 2-е изд., переработ. и доп. – Саранск: Мордовское книжное издательство, 1986. – 124 с.

## Тэма 7. Абсталяванне і арганізацыя працы кабінета беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

Пры напісанні курсавой працы студэнт павінен паказаць, што кабінет беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца не толькі памяшканнем, у якім праводзяцца вучэбныя заняткі і пазакласныя мерапрыемствы, але і своеасаблівым цэнтрам, які каардынуе і аптымізуе навучальны працэс па беларускай мове. У ім павінны захоўвацца розныя дыдактычныя матэрыялы, вучэбна-метадычныя, наглядныя і тэхнічныя сродкі навучання, якія могуць забяспечыць вучэбна-выхаваўчы працэс па прадмеце.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У курсавой працы студэнт можа засяродзіць увагу на афармленні вучэбнага кабінета, які павінен быць аформлены эстэтычна прыгожа. Насценныя планшэты ў кабінеце павінны быць прызначаны функцыянальным задачам.

Асабліва патрэбна звярнуць увагу на сучасны вучэбны кабінет, які можа быць тэхнічна абсталяваным, камп’ютарызаваным. Работа настаўніка ў такім кабінеце значна ўскладняецца, бо, акрамя ўкаранення ў вучэбны працэс розных навучальных і дыягнастычных камп’ютарных праграм, настаўнік абавязаны забяспечыць захаванне здароўя і жыцця школьнікаў.

Пры грунтоўным аналізе гэтай тэмы студэнт можа разглядаць наступныя пытанні:

1. Прызначэнне кабінета беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Афармленне вучэбнага кабінета. (Размяшчэнне матэрыялаў можа быць намалявана на планшэтах або прадстаўлена ў выглядзе камп’ютарнай прэзентацыі).

3. Работа настаўніка-моваведа ў спецыялізаваным кабінеце: сістэматычнае папаўненне нарматыўнымі, вучэбна-метадычнымі і дыдактычнымі матэрыяламі, правядзенне заняткаў.

4. Навучальныя і дыягнастычныя камп’ютарныя праграмы як дыдактычны матэрыял вучэбнага кабінета.

### *Літаратура*

1. Абсталяванне кабінета беларускай мовы і яго выкарыстанне ў навучальна-выхаваўчым працэсе: метад. пісьмо / М-ва асветы БССР, Рэсп. вучэб.-метад. каб.; склад. В.П. Канаш. – Мінск, 1980. – 25 с.

2. *Беспалько, В.П.* Образование и обучение с участием компьютеров: педагогика третьего тысячелетия: учеб.-метод. пособие / В.П. Беспалько. – М.: Педагогика, 2002. – 351 с.

3. *Гершунский, Б.С.* Компьютеризация в сфере образования: проблемы и перспективы / Б.С. Гершунский. – М.: Педагогика, 1987. – 264 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина

4. *Грищенко, П.Л.* Кабинет русского языка и эффективность урока / П.Л. Грищенко // Русский язык в школе. – 1985. – № 4. – С. 21–24.

5. *Жердева, М.В.* Использование кабинета русского языка в малокомплектной сельской школе / М.В. Жердева // Русский язык в школе. – 1985. – № 4. – С. 16–21.

6. *Зельманова, Л.М.* Требования к кабинету русского языка в школе / Л.М. Зельманова // Русский язык в школе. – 1982. – № 5. – С. 31–38.

7. *Кукушин, В.С.* Эстетика учебного кабинета / В.С. Кукушин // Теория и методика воспитательной работы. – Ростов н/Д: ИЦ МарТ, 2002. – С. 320 с.

8. *Ляшчынская, В.А.* Школьны кабінет мовы на філалагічным факультэце / В.А. Ляшчынская // Совершенствование филологического образования студентов в свете реформы общеобразовательной и профессиональной школы: материалы республ. науч.-метод. конф., Минск, 27–28 марта 1987 г. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1989.

9. *Макарова, Т.Н.* Методические материалы по оформлению и содержанию кабинетов образовательных учреждений округа / Т.Н. Макарова // Завуч. – 2001. – № 7. – С. 7–75.

10. Об учебных кабинетах общеобразовательной школы: метод. рекомендации // Начальная школа. – 1982. – № 11. – С. 73–75.

11. Роль учебного кабинета в организации учебно-воспитательного процесса // Педагогика высшей школы. – Минск: Выш. школа. – 1980. – Вып. 5. – С. 35–39.

12. Рак, А.Я. Роля кабінета ў маральным выхаванні школьнікаў / А.Я. Рак, М.А. Станчыц. – Народная асвета. – 1984. – № 7. – С. 70–72.

13. Назарова, Т.С. Совершенствование и развитие кабинетной системы / Т.С. Назарова // Сов. педагогика. – 1982. – № 6. – С. 74–77.

МГПУ им. И.П. Шамякина

## Тэма 8. Дыферэнцыраванае навучанне на ўроках беларускай мовы

Студэнту неабходна адзначыць, што ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі ёсць установы тыпу: ліцэі, гімназіі, а ў сярэдніх агульнаадукацыйных школах – профільныя класы. Такая дыферэнцыяцыя напрамкаў навучання дае магчымасць вучню самастойна ўлічыць асабістую цікавасць, прыроджаныя задаткі і набытыя здольнасці. Патрэбна адзначыць, што сістэма дыферэнцыраванага навучання мае тры ўзроўні: міжшкольны, унутрышкольны і ўнутрыкласны.

Напісанне курсавой працы прадугледжвае разгляд апошняга ўзроўню – унутрыкласнага, які мае сваю арганізацыю і ўключае адпаведны змест адукацыі, пэўныя метады і прыёмы навучання, розныя формы вучэбнай працы, шматлікія сродкі навучання.

Студэнт павінен падкрэсліць, што пры ўмове дыферэнцыраванага навучання настаўнік можа максімальна ўлічыць падрыхтаванасць і магчымасці кожнага вучня. Ён будзе развіваць іх адукацыйныя здольнасці праз выкананне асобных рознаўзроўневых заданняў, якія сістэматызуюць веды вучняў з рознымі фізіялагічнымі задаткамі.

Аналізуючы гэтую праблему, можна разгледзець такія пытанні як:

1. Сутнасць і значэнне дыферэнцыраванага навучання ў педагагічнай дзейнасці настаўніка беларускай мовы.

1.1. Паняцце дыферэнцыяцыі і яе асноўныя функцыі.

1.2. Мэтанакіраванасць, этапы і шляхі рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу на ўроках мовы.

2. Арганізацыя ўнутрыкласнай сістэмы дыферэнцыраванага навучання.

2.1. Метады і прыёмы навучання.

2.2. Формы вучэбнай працы.

3. Рознаўзроўневыя заданні як сродак развіцця адукацыйных здольнасцяў вучняў у працэсе дыферэнцыраваннага навучання.

У практычную частку можна вынесці самастойныя распрацоўкі ўрокаў, у якіх будзе адлюстраваны дыферэнцыраваны падыход у навучанні мове.

МГПУ им. И.П. Шамякина

## *Літаратура*


1. *Бандарэнка, Г.М.* Грані дыферэнцыяцыі / Г.М. Бандарэнка // Народная асвета. – 1996. – № 3. – С. 9–19.

2. *Босы, І.Ч.* Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў праз дыферэнцыяцыю навучання / І.Ч. Босы // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 4. – С. 3–7.

3. *Герасімчык, В.І.* Дыферэнцыяцыя: праблемы ўкаранення / В.І. Герасімчык // Народная асвета. – 1992. – № 2. – С. 6–9.

4. Дыферэнцыраванае навучанне: вопыт Магілёўшчыны / А.П. Раманаў [і інш.] // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 5. – С. 64–68.

5. *Іваноў, Ю.А.* Варыянт сістэмы дыферэнцаванага навучання: навучанне сельскіх школьнікаў / Ю.А. Іваноў // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 1. – С. 77–80.

6. *Іваноў, Ю.А.* Дыферэнцыяцыя навучання – праблема дня: сельская школа / Ю.А. Іваноў // Адукацыя і выхаванне. – 1992. – № 12. – С. 74–79.

7. *Іваноў, Ю.А.* Навучальны план у сістэме дыферэнцыяцыі ў сельскай школе / Ю.А. Іваноў // Народная асвета. – 1991. – № 9. – С. 6–10.

8. *Крайко, Б.М.* Дыферэнцыяцыя адукацыі ў гарадской школе / Б.М. Крайко // Народная асвета. – 1992. – № 1. – С. 6–11.

9. *Кульмянёва, Л.Р.* Работа са студэнтамі па дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання / Л.Р. Кульмянёва // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 2. – С. 34–35.

10. *Ліопа, Т.* Прыступка да поспеху: калектыўныя формы навучальнага ўзаемадзеяння на ўроках беларускай мовы пры дыферэнцаваным навучанні / Т. Ліопа, Т. Прадзед // Роднае слова. – 1994. – № 5. – С. 36–40; № 6. – С. 39–42.

11. *Партык, С.І.* Дыферэнцыраваны падыход да школьнікаў пры індывідуальна-групавым навучанні / С.І. Партык // Народная асвета. – 1991. – № 10. – С. 33–35.

12. *Перавозны, А.У.* Дыдактычныя аспекты дыферэнцыраванага навучання школьнікаў / А.У. Перавозны // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія. – 1995. – № 2. – С. 69–73.

13. *Перавозны, А.У.* Дыдактычныя праблемы дыферэнцыяцыі школьнага навучання / А.У. Перавозны // Народная асвета. – 1996. – № 1. – С. 11–17.


МГПУ им. И.П.Шамякина

14. *Перавозны, А.У.* Дыферэнцыяцыя школьнай адукацыі / А.У. Перавозны // Народная асвета. – 2003. – № 8. – С. 8–10.

15. *Протчанка, В.У.* Дыферэнцыяцыя – не самамэта, а сродак: сельская школа / В.У. Протчанка // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 4. – С. 101–107.

16. *Раманаў, А.П.* Дыферэнцыраванае навучанне: арганізацыйны аспект / А.П. Раманаў // Народная асвета. – 1995. – № 4. – С. 8–19.

17. *Сляпухіна, А.С.* Праблемы дыферэнцыяцыі навучання ў сучаснай школе / А.С. Сляпухіна // Народная асвета. – 2003. – № 8. – С. 11–12.

18. *Смаляроў, М.Р.* З улікам індывідуальнасці: асаблівасці арганізацыі дыферэнцыраванага навучання ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе / М.Р. Смаляроў // Народная асвета. – 1997. – № 9. – С. 16–25.

19. *Смаляроў, М.Р.* Па шляху дыферэнцыраванага навучання / М.Р. Смаляроў // Народная асвета. – 1998. – № 7. – С. 48–57.

## Тэма 9. Метадычная работа настаўнікаў-моваведаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

Пры напісанні курсавой працы студэнту неабходна разгледзець метадычныя аспекты работы настаўнікаў-моваведаў і апісаць іх, паказаць, якімі шляхамі адбываецца павышэнне метадычнага ўзроўню настаўнікаў, як удасканальваюць яны прафесійнае майстэрства. У сувязі з гэтым яму патрэбна пазнаёміцца з публікацыямі часопісаў “Роднае слова”, “Беларуская мова і літаратура”, “Народная асвета” і інш., якія змяшчаюць вопыт працы настаўнікаў беларускай мовы.

Варта засяродзіць увагу на наступныя пытанні:

1. Роля метадычнага кабінета аддзела адукацыі ў працы настаўніка.
2. Арганізацыя работы настаўніка па самаадукацыі.
3. Работа метадычных аб’яднанняў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
4. Метадычныя асновы педагагічных саветаў і нарад пры адміністрацыі школы.
5. Раённыя метадычныя семінары і навукова-практычныя канферэнцыі.

МГПУ им. И.П. Шамякина

6. Курсы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў-філолагаў.

У практычнай частцы курсавой працы студэнт можа прывесці прыкладныя планы работы метадычных аб'яднанняў, педагагічных саветаў і нарад пры адміністрацыі школы.

## *Літаратура*


1. *Антропава, А.* Урокі духоўнасці: з вопыту работы настаўніцы Азершчынскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна Алены Гарнастай / А. Антропава // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1992. – № 4. – С. 9.

2. *Бабруйка, В.* Метадычнае аб'яднанне настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Мазыршчыны: у сумесным пошуку / В. Бабруйка // Роднае слова. – 2009. – № 4. –С. 81–83.

3. *Бруева, Т.* Метадычнае аб'яднанне настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Вілейшчыны: следам за словам / Т. Бруева, І. Шасцілоўская // Роднае слова. – 2009. – № 6. – С. 82.

4. *Граковіч, І.П.* Знайсці сваю сцяжынку / І.П. Граковіч // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1988. – № 3. – С. 13–16.

5. *Граковіч, І.П.* Урокі працавітасці, дабрыні / І.П. Граковіч // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 11. – С. 14–16.

6. *Громак, З.* Працуюць аднадумцы: метады і прыёмы педагогікі супрацоўніцтва на занятках / З. Громак // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 2. – С. 6.

7. *Драздова, Р.* "Зацікаўлена, а не толькі для формы…": метадычная работа па адраджэнні мовы і нацыянальнай культуры / Р. Драздова // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 10. – С. 9.

8. *Казлова, А.У.* Камп'ютарная падтрымка ўрокаў беларускай мовы і літаратуры: з вопыту работы / А.У. Казлова // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 12. – С. 19.

9. *Казубоўская, Г.* Метадычная работа: пошукі, знаходкі / Г. Казубоўская // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1989. – № 4. – С. 4–5.

10. *Капцэвіч, К.* Развіццё творчых здольнасцяў вучняў: з вопыту работы выдатніка народнай асветы Беларусі Леакадзіі Агурцовай / К. Капцэвіч // Роднае слова. – 1997. – № 6. – С. 66.


МГПУ им. И.П. Шамякина

11. *Клёнава, Р.* “Зрабіць свой прадмет любімым…”: з вопыту работы Валянціны Сухадолавай / Р. Клёнава // Роднае слова. – 1992. – № 2. – С. 39–41.

12. *Клімкова, А*. Вучыцца і вучыць / А. Клімкова // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1989. – № 1. – С. 3 – 5.

13. *Кныш, М.А.* Развіваць асобу вучня / М.А. Кныш // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 5. – С. 36–38.

14. *Кульневіч, С.В.* Арганізацыя і змест метадычнай работы / Кіраванне сучаснай школай / С.В. Кульневіч, В.І. Ганчарова, Т.П. Лакаценіна. – Валгаград: Настаўнік, 2005. – Выпуск 2. – 288 с.

15. *Кутузава, Л.* У пошуках новых форм / Л. Кутузава // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 2. – С. 10–12.

